# ВЯЛІКІ АСВЕТНІК З МЯДЗВЯДКІ



4 жніўня ў Карэліцкай раённай бібліятэцы адбыўся вечар-партрэт “Светач сусветнай цывілізацыі”, прысвечаны 220-годдзю з дня нараджэння выдатнага вучонага-земляка Ігната Дамейкі. Гасцямі мерапрыемства сталі ветэраны працы і члены дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ДУ Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Карэліцкага раёна. Удзельнікі вечарыны даведаліся пра жыццёвы шлях і навуковыя дасягненні славутага земляка, які нарадзіўся на Карэліцкай зямлі ў вёсцы Мядзвядка. Аповед арганізатараў вечарыны дапоўнілі дакументальны фільм пра вучонага і кніжная выстава.

Вучоны-даследчык нарадзіўся ў 1802 годзе, рана страціў бацьку, вучыўся ў Шчучынскай піярскай школе, паступіў у Віленскі ўніверсітэт на фізіка-матэматычны факультэт, дзе пасябраваў з Адамам Міцкевічам. За ўдзел у тайным Таварыстве філаматаў быў арыштаваны і, пазбаўлены права знаходзіцца на дзяржаўнай службе, жыў у маёнтках Жыбуртоўшчына (каля Дзятлава) і Заполле (Лідскі павет), дзе гаспадарыў на зямлі. Пасля ўдзелу ў паўстанні супраць царызму ў 1831 годзе вымушаны быў пакінуць родныя мясціны і апынуўся ў Парыжы. Там ён скончыў Парыжскую Горную школу і пачаў працаваць у Эльзасе, займаючыся пошукамі карысных выкапняў.

У 1837 годзе Ігнат Дамейка заключыў 6-гадовы кантракт з чылійскімі ўладамі і накіраваўся ў далёкую краіну, але прабыў ён там не шэсць, а 46 гадоў. За гэты час вучоны зрабіў значны ўклад у развіццё навукі гэтай краіны. Ён стварыў лабараторыю і падрыхтаваў навуковыя кадры для вывучэння прыродных багаццяў Чылі, у час доследных экспедыцый знайшоў багатыя залежы меднай руды, каменнага вугалю, срэбра, чылійскай салетры і іншых карысных выкапняў. Спачатку ён выкладаў хімію, мінералогію і фізіку ў Нацыянальным універсітэце, напісаны ім падручнік па мінералогіі не раз перавыдаваўся, і ім карысталася не адно пакаленне студэнтаў. У 1867 годзе Ігнат Дамейка стаў рэктарам універсітэта ў Сант’яга і чатыры разы выбіраўся на гэтую пасаду. Адначасова з выкладаннем вучоны працаваў над праектам водазабеспячэння Сант’яга і рэформай адукацыі Чылі. Яго пяру належыць 130 навуковых прац, яны былі выдадзены ў Чылі ў пяці тамах. Сабраныя вучоным калекцыі мінералаў захоўваюцца не толькі ў Чылі, але і ў еўрапейскіх універсітэтах.

Імя вучонага добра ведаюць у навуковым свеце: вядомы мінерал “дамейкіт”, фіялка “дамейкіяна”, малюск “наўцілус дамейкус”. Яго імем названы горны ланцуг у Чылі, горад і порт у гэтай краіне, вуліцы, навуковыя ўстановы, бібліятэкі, музеі. Сабраныя вучоным у час падарожжа

па краіне калекцыі мінералаў і этнаграфічныя матэрыялы ляглі ў аснову экспазіцый мінералагічнага і этнаграфічнага музеяў у Чылі.

Ігнат Дамейка быў не толькі выдатным вучоным, але меў адметныя літаратурныя здольнасці, ён добра валодаў пяром, пра што сведчыць яго кніга “Араўканія і яе жыхары” (1845), якая была перакладзена на многія мовы свету, і яго дзённікі, выдадзеныя на польскай, іспанскай, а цяпер і на беларускай мовах пад назваю “Мае падарожжы”. У беларускае выданне кнігі ўвайшлі найбольш цікавыя ўспаміны асветніка, што расказваюць пра яго жыццё, пра падарожжа ў Чылі і вандроўкі па гэтай краіне. Уключана ў гэта выданне і кніга “Араўканія і яе жыхары”, якую Ігнат Дамейка прысвяціў жыццю карэнных жыхароў Чылі – індзейцаў-араўканаў, расказаў асветнік і пра сваё вяртанне на радзіму праз паўстагоддзя.

Пасля доўгай разлукі з роднымі мясцінамі ў 1884 годзе Ігнат Дамейка з хваляваннем зноў ступіў на родную зямлю. Сышоўшы з цягніка ў Гарадзеі, ён трапіў у абдымкі да сваякоў. Яго сустракалі дачка Аніта, зяць Лявон, пляменнікі. Пасля гэтай усхваляванай сустрэчы, пасеўшы ў экіпажы, усе рушылі ў Мядзвядку. Быў цудоўны ранак, і вучонаму здавалася, што нават летняе сонца радуецца яго шчасцю.

А колькі было хвалявання, калі ўбачыў ён мядзвядскую сядзібу! Амаль плачучы, выйшаў ён з экіпажа. Не пазнаў ні двара, ні ганка. Дом быў прыбраны і ўтульны, але не той, што раней. Не пазнаў Ігнат Дамейка і саду – на яго месцы быў парк. Вучоны наведаў магілы братоў, схадзіў у лес, куды хлопчыкам бегаў па грыбы і арэхі. Неба хмурылася, накрапваў дождж, але Ігнат Дамейка не спяшаўся – яго сэрца было перапоўнена радасцю ад сустрэчы з роднымі мясцінамі.



Апошні фотаздымак І. Дамейкі

Прайшоўшы Мядзвядку з канца ў канец, Ігнат Дамейка выйшаў на мост цераз Ушу. Успомніў ён, як іх, малых, купалі ў гэтай рацэ. І прыемна было яму чуць, калі казалі старыя людзі, што памятаюць яго і рады яго вяртанню.

Наведаў вучоны і магілу бацькі, які быў пахаваны ў Міры, каля касцёла. І хоць было Ігнату тады няпоўных сем гадоў, усё ж ён успомніў, дзе магіла бацькі. Успомніў ён і той момант, калі апускалі труну ў магілу, а ён з братамі і дзядзькамі плакаў. На магіле маці ў Сачыўках, Ігнат Дамейка, укленчыўшы, дзякаваў Бога, што дазволіў яму пасля паўвекавога выгнання зноў вярнуцца сюды.

У 1889 годзе, хутка пасля вяртання ў Чылі, вучоны адышоў у вечнасць. На яго магіле ў Сант’яга ўстаноўлены велічны помнік з надпісам – “Вялікі Асветнік”. Удзячныя чылійцы свята захоўваюць памяць пра выдатнага чалавека, які самааддана служыў грамадству. Ушаноўваюць памяць Ігната Дамейкі і на радзіме. У вёсцы Мядзвядка ўстаноўлены памятны знак і помнік слыннаму земляку. IV-я і VI-я Карэліцкія краязнаўчыя чытанні (1997, 2002 гг.) былі прысвечаны спадчыне ўраджэнца Беларусі, нацыянальнага героя Чылі, вучонага-асветніка, падарожніка, пісьменніка Ігната Дамейкі.

У свой час мне давялося весці перапіску з унучатай пляменніцай Ігната Дамейкі, Евай Адахоўскай, якая жыла ў Чылі. Мы сустракаліся з ёй у Міры ў 2002 годзе, калі яна наведала наш раён у час святкавання 200-годдзя з дня нараджэння вучонага. У выніку з’явіліся новыя матэрыялы ў раённым музеі, выставы, прысвечаныя земляку, і мае публікацыі ў кнігах і

навуковых зборніках. У 2002 годзе да юбілею вучонага выйшла мая кніга “Вяртанне на Радзіму”, якая расказвае пра Ігната Дамейку і іншых таленавітых землякоў, якія ўнеслі неацэнны ўклад у скарбніцу навукі, асветы, мастацтва.

Ігнат Дамейка – адзін з буйнейшых дзеячаў духоўнай і матэрыяльнай культуры, яго навуковыя адкрыцці і творчыя дасягненні – гэта агульначалавечы набытак.

**Святлана КОШУР**

Фота з архіва аўтара






Вядучая Валянціна Кошур




Краязнаўца Святлана Кошур






**Вечар-партрэт “Светач сусветнай цывілізацыі”, прысвечаны 220-годдзю з дня нараджэння выдатнага вучонага-земляка Ігната Дамейкі. Карэліцкая раённая бібліятэка. 4 жніўня 2022 года.**



З нашчадкамі І. Дамейкі ў Міры. 2002 г.




Адкрыццё помніка І. Дамейку ў в. Мядзвядка. 2002 г.